Падтрымай "Вясну" на PATREON

Бабруйскі суд зноў аштрафаваў блогера Жалнова

04.04.2014 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед
Крыніца: Прэс-служба БАЖ

Гэтым разам – на 46 базавых велічынь (6.900.000 рублёў).

Разгляд адміністратыўнай справы адбыўся 3 красавіка. Суддзя Бабруйскага раённага суда Наталля Чарапуха прызнала яго вінаватым у парушэнні артыкула 23.4 КаАП – «Непадпарадкаванне законнаму распараджэнню ці патрабаванню службовай асобы пры выкананні службовых паўнамоцтваў».

Гэта выявілася ў тым, што 4 лютага 2014 г. Алег Жалноў, ідучы на прыём да выканаўцы абавязкаў начальніка Бабруйскага адзела Следчага камітэта, не здаў дзяжурнаму УУС мабільныя тэлефоны, 3G мадэм і карту памяці.

Абвінаваўцы даводзілі, што УУС – рэжымны аб'ект, і што дзяжурны дзейнічаў у адпаведнасці з загадам міністра ўнутраных спраў №185 (для службовага карыстання) і інструкцыі да яго, якая вызначае забароненыя да праносу на рэжымныя аб'екты рэчывы і прадметы.

Блогер будаваў сваю абарону на тым, што загады і распараджэнні міністра не распаўсюджваюцца на цывільных асобаў. Па яго перакананні, не ўстаноўлена, ці з'яўляецца УУС Бабруйскага гарвыканкама рэжымным аб'ектам. Таксама існуе Пастанова Савета міністраў, у адпаведнасці з якой усе датычныя грамадзян нарматыўна-прававыя акты павінныя быць апублікаваныя і мець адкрыты статус, – даводзіў падсудны. А паколькі загад № 185 не зарэгістраваны ў рэестры дзяржаўных актаў, то ён не з'яўляецца абавязковым для выканання грамадзянамі, лічыць ён.

Нагадаем, што 17 сакавіка 2014 той жа суд аштрафаваў Алега Жалнова на 45 базавых велічынь па абсалютна аналагічным абвінавачанні. Толькі ў той раз, 30 студзеня, блогер пранес тэлефон на прыём да начальніка УУС Бабруйскага гарвыканкама і выклаў запіс на Youtube.

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 958 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул
"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)
Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)
Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ

"Я, напэўна, проста памру тут": хто з палітвязняў знаходзіцца ў асаблівай рызыцы за кратамі



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

"Бяляцкі, прасі літасці!" У Швецыі прадставяць спектакль-чытку паводле твораў Бяляцкага і Знака

Валерыя Цапкалу завочна асудзілі да 17 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму (дапоўнена)

Запрашаем на прэзентацыю дакладу “Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам” у Вільні

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh











E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS